

ЛЕТА ПРАЦЯГВАЕЦЦА 4

САКРЭТ СЯМЕЙНАГА ШЧАСЦЯ 13



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

8 ВЕРАСНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 174 (30054)

## ЛІЧБА ДНЯ

**Амаль 8 мільярдаў долараў**

*склалі, паводле папярэдніх даных, міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі. Аб гэтым паведамілі ў Нацыянальным банку. За жнівень золатавалютныя рэзервы нашай краіны ўзраслі на 17,7 мільёна долараў (0,2 працэнта).*

З першых вуснаў

# «МІНСК ВЫСТУПАЕ ЗА СПРАВЯДЛІВЫ, ШМАТПАЛЯРНЫ СВЕТ, І МЫ ІДЗЁМ У АФРЫКУ ЯК СЯБРЫ»

### Чым Беларусь можа дапамагчы Экватарыяльнай Гвінеі — падрабязнасці перагавораў Прэзідэнтаў

**Беларусь упэўнена працягвае свой курс на ўмацаванне супрацоўніцтва з краінамі Афрыканскага кантынента. Гэтымі днямі праходзіць візіт дэлегацыі Экватарыяльнай Гвінеі краіны на чале з яе Прэзідэнтам Тэадора Абіянгам Нгемам Мбасога. Гэта першы афіцыйны візіт Прэзідэнта Мбасога ў Беларусь. Прыём дэлегацыі з Экватарыяльнай Гвінеі ў Беларусі пацвярджае ўзаемны інтарэс, запатрабаванасць айчыннай прадукцыі і тэхналогій. У графіку дэлегацыі Экватарыяльнай Гвінеі — наведванне беларускіх прадпрыемстваў, знаёмства з патэнцыялам беларускага аграрнага сектара.**



Фота БелТА.

Ключавая падзея візіту — перагаворы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Экватарыяльнай Гвінеі Тэадора Абіянгам Нгемам Мбасога. Сустрэча ў Палацы Незалежнасці пачалася з традыцыйнай для такіх візітаў афіцыйнай цырымоніі з удзелам роты ганаровай варты.

### «Мы адкрываем перад вамі нашыя сэрцы»

Работа кіраўнікоў дзяржаў пачалася з перагавораў у вузкім саставе. Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, калі ў нас на поўначы кажуць пра Афрыку, гэта ўспрымаецца як нешта рамантычае і загадкавае. «Кожны ўспрымае гэты кантынент па-рознаму. Але ўсе абсалютна згодныя з меркаваннем, што будучыня нашай планеты шмат у чым належыць ад Афрыцы. Я таксама прытрымліваюся такой думкі. Для мяне Афрыка — ужо не загадкавы кантынент», — адзначыў ён. Беларускі лідар расказаў, што раней пераважна наведваў паўночную Афрыку, але ў апошнія гады яму ўдалося пабываць у цэнтры Афрыкі і на поўдні кантынента. «Таму я ўяўляю, што такое Афрыка. І я рады тым працэсам, якія сёння праходзяць у Афрыцы; тым працэсам, якім схільная Афрыка», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён заўважыў, што Афрыка развіваецца. Дзяржавы Афрыканскага кантынента набываюць сваю незалежнасць. Словам, Афрыка вызваляецца ад сваёй каланіяльнай спадчыны. «Вы павінны ведаць, што мы ўсяляк адданыя гэтаму працэсу і будзем усяляк падтрымліваць тыя дзяржавы, якія жадаюць здабыць сваю незалежнасць», — запэўніў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь — тэхналагічная краіна, якая гатовая перадаць свае тэхналогіі народу Экватарыяльнай Гвінеі. «Вы нешта ўбачыце ў нас, пазнаёміцеся з нашымі вытворчасцямі. І калі вам нешта спадабаецца, калі мы на нешта здольныя, калі мы, з вашага пункту гледжання, можам дапамагчы вашай дзяржаве і Афрыцы ў цэлым, вы нам скажыце, мы абавязкова зробім. Абавязкова зробім. Вы павінны ведаць, што вы для нас не чужыя людзі, для беларусаў, для расіян не чужыя. Таму што ў нас ёсць гісторыя супрацоўніцтва, якая адыходзіць у глыбіню развіцця і існавання Савецкага Саюза», — сказаў ён.

СТАР. 2

## КАРАТКА

- **Беларусь і Расія перайшлі на аўтастраханванне па «Сіняй карце».**
- Беларусбанк знізіў стаўкі па раней атрыманых крэдытах на нерухомасць.
- **Беларуска Вольга Масціцкая стала ўдзельнікам эксперымента па імітацыі палёту на Месяц.**
- У Беларусі можна анлайн праверыць сапраўднасць любых дакументаў, якія пацвярджаюць асобу.
- **БРСМ запусціў у сацсетках праект да Дня народнага адзінства — гэта патрыятычная маска ў Instagram.**



- За сем месяцаў гэтага года арганізацыі «Беллеспапераправа» нарасцілі экспарт у Кітай на чвэрць.
- **У Беларусі пачалася ўборка кукурузы на зерне.**
- Каля 400 сталічных студэнтаў збяруцца прадпрымальніцкі форум Space Day БДУ.
- **Вадзіцелі кар'ерных самазвалаў будуць змагацца за званне найлепшага ў «Клубе аператараў БелАЗ».**

Напярэдадні

# МІНСК — ГОРАД УСМЕШАК

**Напярэдадні Дня горада старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ сустрэўся з журналістамі рэспубліканскіх СМІ і падрабязна адказаў на іх шматлікія пытанні.**



СТАР. 4

Нашы людзі

# Не хлебам адным

### Як гаспадарка пад Полацкам пабудавала сваю царкву і пасадзіла сад

**Раней бульбу ў прамысловых маштабах вырошчвала амаль кожнае сельскагаспадарчае прадпрыемства, цяпер такіх няшмат. У паўночным рэгіёне значныя плошчы яе на Талачынскім кансервавым заводзе і ў ААТ «Кушлікі» Полацкага раёна. У апошняй гаспадарцы сёлета пад другі хлеб адведзена 196 гектараў, але бульба — не адзіны напрамак, на якім спецыялізуюцца аграрыі.**

Адкрытае акцыянернае таварыства «Кушлікі» — шматпрофільнае сельскагаспадарчае прадпрыемства Полацкага раёна, якое займаецца жывёлагадоўляй, вырошчвае гародніну і рэалізоўвае элітнае насенне. Дойны статак гаспадаркі налічвае 665 галоў буйной рагатай жывёлы, а агульная плошча сельскагаспадарчых угоддзяў прадпрыемства — амаль 3800 гектараў. «Кушлікі» не ўваходзяць у агрaхолдынг, жывуць на свае сродкі. 50 працэнтаў даходаў прадпрыемства атрымлівае ад жывёлагадоўлі, астатнія 50 — ад раслінаводства. Але расказваць пра дасягненні гэтай гаспадаркі без аповеду пра атмасферу ў калектыве і людзей немагчыма.



Намеснік дырэктара па вытворчасці Аліна ЗАВАДСКАЯ ў яблыневым садзе.

СТАР. 13

ISSN 1990 — 763X

23174>

9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2023 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «МІНСК ВЫСТУПАЕ ЗА СПРАВЯДЛІВЫ, ШМАТПАЛЯРНЫ СВЕТ, І МЫ ІДЗЁМ У АФРЫКУ ЯК СЯБРЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Паколькі вы для нас блізкія і не чужыя людзі, мы вас запрашаем у Беларусь і адкрываем перад вамі нашыя сэрцы», — дадаў беларускі лідар.

### «Беларускі народ з'яўляецца брацкім для нас»

У сваю чаргу Тэадора Абіянг Нгема Мбасога падзякаваў за цёплы прыём і гасціннасць. «Хацеў бы адзначыць, што мой прыезд у Беларусь з'яўляецца сведчаннем маёй перакананасці ў тым, што беларускі народ з'яўляецца брацкім для нас, а Беларусь — брацкай для нас краінай», — сказаў ён.

Тэадора Абіянг Нгема Мбасога падкрэсліў, што акрамя пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва хацеў бы абмеркаваць з Прэзідэнтам Беларусі і міжнародную праблематыку. «Пры гэтым падкрэсліваю, што мы не забываемся: менавіта Савецкі Саюз, краіны былога Савецкага Саюза адыгралі вялікую ролю ў вызваленні афрыканскага кантынента ад каланіяльнай залежнасці і працягваюць гэта рабіць, — сказаў ён. — Мы набліжаемся да святкавання 100-годдзя набыцця незалежнасці шэрагу афрыканскіх дзяржаў. Але разумеем, што гаворка ідзе аб набыцці свайго роду намінальнай незалежнасці. Мы працягваем заставацца ахвярамі неакаланіялізму, працягваем адчуваць на сабе ціск тых краін, якія спрабуюць працягваць гэтую палітыку».

### «Відавочна, што Афрыка перажывае своеасаблівы рэнесанс»

Лідары Беларусі і Экватарыяльнай Гвінеі працягнулі абмяркоўваць пытанні супрацоўніцтва ў пашыраным складзе. Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз прывітаў членаў дэлегацыі на беларускай зямлі. Па выніках перагавораў у вузкім складзе ён адзначыў адкрытасць бакоў і гатоўнасць да абмеркавання шырокага спектра пытанняў.

«Відавочна, што Афрыка перажывае своеасаблівы рэнесанс. На нашых вачах яна становіцца ключом да ўстойлівага развіцця планеты ў XXI стагоддзі. Сумесная міратворчая місія лідараў краін Афрыканскага саюза ва Украіну і Расію, актыўная роля Афрыкі ў БРІКС, а таксама Руху недалучэння яскрава пацвярджаюць гэта», — сказаў беларускі лідар. Па яго словах, краіны кантынента рашуча настроены выйсці з-пад дыктату заходніх транснацыянальных карпарацый, якія навязалі ім ролю сыравінных прыдаткаў, выпампоўваючы нафту, золата, газ, выракаючы народы Афрыкі на вартае жалю існаванне і голад.

«Беларусь жа ў адрозненне ад заходніх «дэмакратызатараў» гатова дапамагчы вам быць гаспадарамі на сваёй зямлі на карысць уласнага народа: стварыць нацыянальную прамысловасць, мадэрнізаваць сельскую гаспадарку, развіваць навуку і тэхналогіі. Працуючы ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, сумесна з Расіяй і іншымі рэспублікамі былога СССР, прапануем вашай краіне доступ да ўнікальных тэхналогій, тавараў і паслуг», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што Беларусь тры дзесяцігоддзі жыве пад ціскам Захаду і катэгарычна не прымае любыя спробы ціску. Пры гэтым беларусы не толькі не пакутуюць на каланіяльныя звычкі, але і не спрабуюць нікому нічога навязваць.

«Мінск выступае за справядлівы, шматпалярны свет, і мы ідзём у Афрыку як сябры. Нашы тэхніку і тэхналогіі добра ведаюць на вашым кантыненце, а многія вашы ўрачы і інжынеры вучыліся ў беларускіх ВНУ, таму ў нас не павінна быць асаблівых цяжкасцяў у наладжванні дыялогу. Перакананы, і не будзе», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб тым, што гісторыя вучыць, што незалежнасць і суверэнітэт краіны — гэта перш за ўсё моцная эканоміка. «У нас ёсць досвед, напрацоўкі, каб стаць актыўным удзельнікам сацыяльна-эканамічнага росквіту Афрыкі і канчатковага яе вызвалення ад прыгнёту былых метраполій. Беларусь гатова дапамагчы ў індустрыялізацыі вашай краіны, мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі і забеспячэнні харчовай бяспекі, пастаўках шырокага спектра тэхнікі, іншай прамысловай і харчовай прадукцыі», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь таксама мае добрыя кампетэнцыі ва ўзвядзенні сучасных мяса-малочных і іншых перапрацоўчых комплексаў, разведцы і здабычы карысных выкапняў, рэалізацыі сумесных інфраструктурных праектаў. Па яго словах, шмат магчымасцяў для супрацоўніцтва дае гуманітарная сфера — навука, культура, адукацыя, турызм. Медыцынскую дапамогу самага высокага ўзроўню грамадзянам Экватарыяльнай Гвінеі могуць аказаць беларускія арганізацыі аховы здароўя. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што беларускі бок можа дапамагчы і кадрамі дактароў, навучыць грамадзян Экватарыяльнай Гвінеі ў галіне аховы здароўя, адукацыі і іншых кірунках.

«Нашы дасягненні ў транспланталогіі, кардыялогіі, анкалогіі, рэабілітацыі, ахове мацярынства і дзяцінства шырока вядомы далёка за межамі Беларусі», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сумесная работа дзелавых колаў і нацыянальных гандлёва-прамысловых палат павінна стаць ключавым звяном у працэсе выбудоўвання і фарміравання новых устойлівых бізнес-сувязяў.

«Важным крокам для развіцця ўсебаковага супрацоўніцтва па выніках вашага візіту будзе стварэнне Сумеснай камісіі. Прапаную даручыць міністрам замежных спраў як сустаршыням Сумеснай камісіі правесці яе першае пасяджэнне ў самыя кароткія тэрміны і вызначыць канкрэтныя планы і праекты, у тым ліку абапіраючыся на нашыя дамоўленасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### «Мы маем намер і надалей развіваць сувязі з краінамі Афрыканскага кантынента»

Па заканчэнні перагавораў Прэзідэнты сустрэліся з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што першы візіт на вышэйшым узроўні дэманструе сумесную зацікаўленасць у актывізацыі і паглыбленні супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі.

«Адкрытая, дружалюбная, канструктыўная размова паказала, што нашы ацэнкі сітуацыі ў рэгіёне і свеце цалкам супадаюць. Як для Беларусі, так і для Экватарыяльнай Гвінеі шматпалярны справядлівы свет, дзе любыя пытанні будуць вырашацца за сталом шчырых перагавораў, у сумленным, паважлівым і раўнапраўным дыялогу, не мае альтэрнатывы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, нягледзячы на ціск і супрацьдзеянне шэрагу буйных сусветных гульцоў, голас Афрыкі на карысць непазбежнасці такога светаўладкавання чуваць больш выразна.

«Мы бачым, што дзяржавы Афрыканскага кантынента ўсё больш рашуча праводзяць самастойную, суверэнную і міралюбівую палітыку, не азіраючыся на краіны так званага залатога мільярда», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён заявіў, што Мінск паслядоўна на працягу многіх гадоў усяляк падтрымлівае гэтае імкненне. Візіты ў Зімбабвэ, кантакты на вышэйшым узроўні з Егіптам, планы па рабоце з Кеніяй, Мазамбікам, Нігерыяй, Угандай, ПАР і шэрагам іншых дзяржаў — таму пацвярджэнне. «Мы маем намер і надалей развіваць сувязі з краінамі Афрыканскага кантынента. Вітаем мірныя ініцыятывы кіраўнікоў афрыканскіх дзяржаў па ўрэгуляванні ўкраінскага крызісу. Салідарныя з тым, што неабходна як мага хутчэй спыніць гібель і пакуты людзей», — адзначыў беларускі лідар.

Што да двухбаковага парадку дня, то, па словах Аляксандра Лукашэнкі, зроблены добры задзел на будучыню. Ён расказаў, што са сваім калегам з Экватарыяльнай Гвінеі яны вызначылі перспектыўныя сферы і кірунні развіцця партнёрства, узгаднілі практычныя крокі па рэалізацыі дасягнутых дамоўленасцяў, дамовіліся аб абменах візітамі, абазначылі асновы дагаворна-прававой базы, стварылі Сумесную камісію па эканамічным супрацоўніцтве.

«Цікавасць краін адна да адной велізарная. Бягучая сітуацыя ў свеце падштурхоўвае да больш актыўнага ўзаемадзеяння. Я ўжо сказаў свайму калегу і сябру, што Экватарыяльную Гвінею, невялікую, незалежную дзяржаву, але багатую на рэсурсы ў спакоі не пакінуць. Ён са мной пагадзіўся. На жаль, сучасны свет трымаецца на моцных, і той застанецца існаваць у гэтым свеце, хто будзе мець сілу сябе абараніць. Гэта ВПК, гэта абарона. У гэтым плане мы будзем разам працаваць, каб дапамагчы вашай дзяржаве. Перакананы, праз кароткі час мы заключым новыя кантракты і пакладзём у скарбонку нашых адносін некалькі дзясяткаў мільёнаў долараў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы не толькі прапануем вам свае тавары і гатовыя выкупляць у вас вашы. Нам трэба кааперавацца, нам трэба ствараць сумесныя прадпрыемствы, якія будуць вырабляць гэтыя тавары. Трэба ісці глыбей. Мы гатовы да гэтага. Мы гатовы падрыхтаваць вашых спецыялістаў, якія будуць працаваць на прадпрыемствах з перадавымі тэхналогіямі ў Экватарыяльнай Гвінеі», — сказаў беларускі лідар.

Па словах Прэзідэнта, будзе пашырана партнёрства ў нафтахімічным сектары і здабыўной прамысловасці, у адукацыі і падрыхтоўцы кадраў, медыцыне, развіцці чалавечых сувязяў. «Разлічваем, што сумеснымі намаганнямі мы даб'ёмся няўхільнага росту тавараабароту паміж краінамі, аб'ём якога да 2030 года перасягне 100 мільёнаў долараў», — сказаў ён.

### Супрацоўніцтва будзе ўзаемавыгадным

У сваю чаргу Тэадора Абіянг Нгема Мбасога выказаў удзячнасць беларускаму боку за праяўлены дружалюбны падыход і гатоўнасць да сумеснай работы. «Мы падзяляем гатоўнасць да рэалізацыі сумеснай эфектыўнай работы, да рэальнай кааперацыі, якая дасць магчымасць нам рэалізаваць патэнцыял нашых краін. Відавочна, што гэта супрацоўніцтва можа стаць своеасаблівай платформай не толькі для таго, каб дапамагчы Экватарыяльнай Гвінеі, але і іншым афрыканскім дзяржавам, якія пакутуюць ад крайняй галечы», — падкрэсліў ён. Тэадора Абіянг Нгема Мбасога заявіў аб намеры дабівацца сапраўднай эканамічнай незалежнасці, падкрэсліў неабходнасць навязаць новы эканамічны парадак. Па яго словах, супрацоўніцтва і кааперацыя з Беларуссю будуць вельмі карысныя. «Мы прыехалі сюды і хочам атрымаць падтрымку той работы, якую робіць Экватарыяльная Гвінея сваімі сіламі, каб забяспечыць трансфармацыю», — растлумачыў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што супрацоўніцтва з Беларуссю будзе ўзаемавыгадным і ад яго выйграюць і іншыя краіны рэгіёна. У ліку прапаноў, агучаных Тэадора Абіянгам Нгемам Мбасога, таксама сумесны ўдзел у гандлёвых альянсах, супольнасцях з магчымасцю выхаду на шырокія рынкі суседніх краін Афрыканскага кантынента.

«Відавочны той факт, што свет мае патрэбу ў змяненнях. Але яны павінны адбывацца праз стварэнне новых альянсаў. Манаполія павінна завяршыцца», — перакананы Прэзідэнт Экватарыяльнай Гвінеі.

Паводле яго слоў, дзяржавы, якія некалі каланізавалі краіны Афрыкі, лічаць, што ў іх ёсць права эксплуатаваць прыродныя рэсурсы гэтага рэгіёна «ў абмен на нішто». У якасці прыкладу ён прывёў узаемаадносіны Нігера і Францыі, дзе апошняя з выключнай выгадай для сябе эксплуатавала радовішчы ўрану. Тэадора Абіянг Нгема Мбасога канстатаваў, што Афрыка ўжо не такая, як была раней. Па яго словах, у найбліжэйшыя гады гэты кантынент чакаюць вялікія перамены. А значыць, неабходны і новы светапарадак.

«Для надання дынамікі нашаму супрацоўніцтву Экватарыяльная Гвінея абяцае акрэдытаваць паўнамоцнага пасла ў Мінску. І гэтак жа я папрасіў беларускі бок, каб у Экватарыяльнай Гвінеі быў акрэдытаваны пасол Беларусі. Такім чынам дыпламаты нададуць дадатковую дынаміку ўсім тым дамоўленасцям, якія дасягнуты сёння», — сказаў Тэадора Абіянг Нгема Мбасога. Прэзідэнт Экватарыяльнай Гвінеі перакананы, што ўсе двухбаковыя дакументы, якія падпісаны ў Мінску падчас афіцыйнага візіту, пяройдуць з тэарэтычнай у практычную плоскасць.

Па выніках перагавораў прэзідэнтаў Беларусі і Экватарыяльнай Гвінеі падпісаны шэраг міжнародных дакументаў. У прыватнасці, міжурадавыя рамачнае пагадненне аб эканамічным, гандлёвым, культурным, навуковым і тэхнічным супрацоўніцтве, пагадненне аб бязвізавых паездках для ўладальнікаў дыпламатычных і службовых пашпартоў. Падпісаны таксама пагадненні аб супрацоўніцтве ў сферы аховы здароўя і ў галіне адукацыі, мемарандум аб узаемаразуменні паміж профільнымі ведамствамі дзвюх краін па пытаннях супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі. Пагадненне заключылі Міністэрства культуры Беларусі і Міністэрства культуры, рамёстваў і турызму Экватарыяльнай Гвінеі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

---

**У тэму**

## Беларусь у Афрыцы ведаюць

**Міністр замежных спраў Сяргей АЛЕЙНІК** расказаў, што ў Беларусі і Экватарыяльнай Гвінеі дакладна выяўлены ўзаемны інтарэс. «Экватарыяльная Гвінея — адна з вядучых эканомік афрыканскага кантынента. Краіна самадастатковая з пункту погляду сыравіннай базы і сыравінных рэсурсаў, займае трэцяе месца па аб'ёмах здабычы нафты. Яна мае развітую транспартную і партовую інфраструктуру. Вядома, краіна сёння мае патрэбу ў развіцці прамысловасці, перапрацоўчай галіны, сельскай гаспадаркі і забеспячэння харчовай бяспекі — гэта тыя нішы, якія выклікаюць інтарэс кіраўніцтва Экватарыяльнай Гвінеі і дзе нашы кампетэнцыі і тэхналогіі могуць быць запатрабаваны», — сказаў Сяргей Алейнік. Ён падкрэсліў, што Афрыканскі кантынент сёння мае вялікую патрэбу і ў збожжы, і ў прадуктах харчавання. І гэта можа стаць асновай, на якой будзе пабудавана супрацоўніцтва дзвюх краін. Перспектыўным бачыцца супрацоўніцтва ў адукацыі, турызме, ахове здароўя.

«Сёння многія краіны праяўляюць цікавасць да Беларусі. Нашы кантакты на палях апошняга саміту БРІКС гэта пацвердзілі. На саміце прысутнічалі дэлегацыі 43 афрыканскіх краін, і многія падыходзілі да нас і выказвалі свой інтарэс у выбудоўванні супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння з акцэнтам на прамысловую кааперацыю, у сферы сельскай гаспадаркі, перапрацоўчай прамысловасці. Таму Беларусь у Афрыцы ведаюць, і, спадзяюся, што пасля гэтага візіту даведаюцца пра яе яшчэ больш», — расказаў міністр.

Дарэчы, Сяргей Алейнік 7 верасня прыняў копіі даверчых грамат Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Экватарыяльная Гвінея ў Рэспубліцы Беларусь па сумяшчальніцтве Ндонга Аекабы Лучана Нкога.

У размове з журналістамі **міністр замежных спраў Экватарыяльнай Гвінеі Сімяон Аёна Эсона АНГУЕ** падкрэсліў, што візіт Прэзідэнта гэтай краіны ў Беларусь стаў беспамылковым паказчыкам таго, што нашы краіны і ў далейшым гатовы развіваць двухбаковыя адносіны ў розных сектарах эканомікі.

«Беларусь з'яўляецца дружалюбнай краінай, брацкай, і мы цэнім імкненне Беларусі вырашыць усе канфлікты мірным шляхам. Мы задаволены вынікамі перагавораў і будзем працаваць разам для таго, каб і ў далейшым развіваць двухбаковыя адносіны і эканамічнае супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі», — падкрэсліў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Экватарыяльнай Гвінеі.

У кантэксце расследавання

# Новыя падрабязнасці справы аб генацыдзе

## Дзякуючы распрацоўкам айчынных навукоўцаў пад Мінскам выяўлены новыя месцы масавага знішчэння грамадзян у гады вайны

**Тое, што ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі, у лясным масіве ўрочышча Уручча, нацысты забілі вялікую колькасць людзей, стала вядома адразу пасля вызвалення Беларусі. Акт Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, датаваны ліпенем 1944 года, сведчыў, што тут было знішчана звыш 57 тысяч грамадзян. У памяць аб бязвінна расстраляных савецкіх воінах, партызанах і мірных людзях у 1959 годзе на 9-м кіламетры маскоўскай шашы з'явіўся мемарыял. Аднак калі Генеральная пракуратура ў красавіку 2021 года ўзбудзіла крымінальную справу па факце генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд, стала зразумела: маштаб трагедыі значна большы.**



З часоў вайны з архіўных крыніц было вядома месцазнаходжанне трох ям-магіл, у якіх пахавана каля 20 тысяч людзей. Выяўленнем астатніх, у якіх вечным сном спіць звыш 30 тысяч чалавек, на працягу двух гадоў займалася Генеральная пракуратура. Дзякуючы расследаванню крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа, удалося ўстанавіць месцазнаходжанне 11 ям-магіл. Усе яны былі з высокай дакладнасцю вызначаны дзякуючы прымяненню новага праграмнага комплексу беларускіх вучоных. Шэсць абсалютна новых пахаванняў, аб якіх дагэтуль увогуле адсутнічалі якія-небудзь звесткі, пракурорскія работнікі з прыцягненнем спецыялістаў і абсталявання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта знайшлі зусім нядаўна.

Раней невядомыя месцы масавага забойства і пахавання мірных жыхароў і ваеннапалонных ва ўрочышчы Уручча, устаноўленыя ў ходзе расследавання, наведалі прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка, генеральны пракурор Андрэй Швед і міністр абароны Віктар Хрэнін.

### «Трэба дакапацца да ісціны»

Як расказаў **прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА**, паралельна з пошукам невядомых месцаў пахавання ахвяр генацыду і ваеннаслужачых Чырвонай Арміі працуе міжведамасная камісія, якая была створана ўрадам для вызначэння памераў урону і ўдакладнення ацэнак тых трагічных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі, працуюць вучоныя і архівісты. «Работа ідзе маштабная, шматвектарная і скаардынаваная, — падкрэсліў кіраўнік урада. — Паралельна ажыццяўляецца рэалізацыя дзяржаўнай праграмы па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войн, у рамках якой адбываецца мемарыялізацыя памятных месцаў, устанаўленне імён загінулых, новых месцаў генацыду беларускага народа».

Па словах прэм'ер-міністра, крымінальная справа аб генацыдзе беларускага народа будзе расследавацца яшчэ некаторы час. «Трэба дакапацца да ісціны і даць канчатковую дзяржаўную ацэнку гэтаму жахліваму злачынству супраць нашай краіны, нашага народа», — паведаміў Раман Галоўчанка.

Па папярэдняй ацэнцы спецыялістаў, у кожнай яме-магіле — ад тысячы да васьмі тысяч астанкаў. Дакладная лічба ахвяр, выяўленых у ямах-магілах, будзе ўстаноўлена пасля правядзення работ па эксгумацыі. Ужо вядома тое, што сярод забітых — як ваеннапалонныя, так і мірныя жыхары. На гэта ўказваюць фрагменты абутку, асабістыя рэчы ахвяр. Сярод спадарожных знаходак — ключы, запальніца, нож, гадзіннік кішэнны, люстэрка, акуляры, аловак, гузікі, манеты, фрагменты купюр, флакон з духамі... Мяркуецца, што рэчавых доказаў генацыду беларускага народа будзе яшчэ больш: гэтыя рэчы знойдзены пры падняцці першага слоя глебы. Спецыялісты сцвярджаюць, што ў ямах-магілах — па тры-чатыры слаі. Прычым цалкам верагодна, што колькасць пахаванняў устаноўлена неканчаткова.



### «З гэтым нельга змірыцца»

**Генеральны пракурор Андрэй ШВЕД** заўважыў, што ўрочышча Уручча сведчыць аб рэальных маштабах трагедыі, якая адбылася на нашай зямлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. «Па ўсёй краіне кожны дзень вядзецца работа следчай групай Генеральнай пракуратуры з прыцягненнем спецыялістаў Міністэрства абароны, нам дапамагаюць калегі са Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, — расказаў аб ходзе расследавання кіраўнік ведамства. — Толькі сёлета зроблены або ўжо завяршаюцца агляды ў 40 месцах. Інфармацыю мы атрымліваем з розных крыніц: гэта і архівы, і паказанні сведак, іншыя даныя. Прыкладна адна траціна не пацвярджаецца ў сілу розных прычын, але ў астатніх выпадках мы выяўляем месцы пахаванняў, вырабляем агляды і фіксацыю доказаў, у тым ліку для будучых працэсаў, якія хутка пачнуцца ў Беларусі ў дачыненні да злачынцаў, няхай і памерлых, якія не панеслі заслужанага пакарання».

Першыя матэрыялы ў дачыненні да Катрука — ката, які служыў ва ўкраінскім нацыяналістычным карным батальёне, — Генеральная пракуратура плануе накіраваць у суд у лістападзе. «Праца практычна завершана, цяпер мы ўдакладняем юрыдычныя працэдуры, у тым ліку шукаем яго сваякоў, каб апавясціць пра пачатак працэсу, — распавёў дэталі Андрэй Швед. — Сёлета пойдуць матэрыялы ў адносінах яшчэ двух карнікаў. У наступным годзе мы плануем не менш 15—20 матэрыялаў накіраваць у суды, каб у парадку, устаноўленым законам, даказаць і вызначыць віну катаў, якія знішчалі тут мірных людзей і ваеннапалонных».

Генеральны пракурор акцэнтаваў увагу на тым, што расследаванне праводзіцца не толькі для таго, каб выявіць месцы масавых пахаванняў, але і для таго, каб людзі ведалі рэальныя маштабы трагедыі, каб устанавіць хоць некалькі прозвішчаў. Што датычыцца ўрочышча Уручча, то на цяперашні час устаноўлены асобы дваіх загінулых: адзін з'яўляўся ўраджэнцам Узбекістана, другі — родам з Расіі. Апошні прызываўся ў Чырвоную Армію ў верасні 1941 года і лічыцца зніклым без вестак пад Ржэвам у лютым 1942 года.

Андрэй Швед расказаў, што ў расследаванні крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа прымаюць актыўны ўдзел і звычайныя людзі. «Мы закранулі пласт болю і памяці, якая жыве ў кожным з нас, — перакананы кіраўнік ведамства. — Людзі настолькі неабыякавыя, з гэтым нельга змірыцца».

### «Фальсіфікацыя гісторыі — жудасная зброя»

Як звярнуў увагу **міністр абароны Віктар ХРЭНІН**, сёння вельмі шмат тых, хто жадае сказіць гістарычную праўду. «Фальсіфікацыя гісторыі — гэта жудасная зброя, зброя, з дапамогай якой рэабілітуецца нацызм, гераізуюцца нацысцкія злачынцы і іх памагатыя, — падкрэсліў кіраўнік абароннага ведамства. — Таму Міністэрствам абароны Беларусі праводзіцца шматпланавая работа па недапушчэнні фальсіфікацыі гістарычнай праўды. І флагманам у гэтай рабоце ў нас выступае 52-і асобны спецыялізаваны пошукавы батальён Узброеных Сіл».

Ваеннаслужачыя цесна ўзаемадзейнічаюць з Генеральнай пракуратурай па крымінальнай справе, узбуджанай па факце генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сіламі батальёна толькі ў 2022 годзе адпрацавана 105 пошукавых аб'ектаў, падняты астанкі больш як дзвюх тысяч загінулых, устаноўлена 120 імёнаў, выяўлена звыш тысячы выбухованебяспечных прадметаў. У бягучым годзе пошукавая дзейнасць актыўна працягваецца. Воінамі-пошукавікамі ўжо адпрацавана звыш 110 пошукавых аб'ектаў, знойдзены астанкі больш як 780 ваеннаслужачых і 270 ахвяр вайны, устаноўлены звесткі аб 40 з іх.

«Ваеннаслужачыя батальёна разумеюць, якую важную работу яны робяць, таму мы падаўжаем тэрміны пошукавага перыяду, — удакладніў Віктар Хрэнін. — Летась было прынята рашэнне аб павелічэнні колькаснага складу падраздзялення. Усё гэта робіцца з адной мэтай — не аддаць забыццю гераічнае мінулае нашага народа; не забыць тыя злачынствы, якія адбываліся на нашай зямлі, каб ніколі гэтага не паўтарылася».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Акцыя

# 17 верасня ў Мінску з'явіцца алея сцягоў

## Гэта стане фінальным акордам 10-дзённай акцыі

**Учора з найвышэйшага пункта Беларусі — гары Дзяржынскай — стартавала маштабная патрыятычная акцыя «Сімвал Адзінства — 2023». Ва ўрачыстым мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі раёнаў Мінскай вобласці, актывісты грамадскага аб'яднання «Патрыёты Беларусі», удзельнікі аўтапрабегу «Сімвал Адзінства — 2023». Сама акцыя складаецца з аўтапрабегу, канцэртаў, дыялогавых пляцовак, але самае галоўнае — з радасці і падзякі за тое, што мы жывём у адзінай краіне ўсе разам у міры і згодзе.**

Наша краіна захоўвае свой суверэнітэт і незалежнасць дзякуючы адзінству і велізарнаму інтэлектуальнаму і творчаму патэнцыялу працавітых і ахвотных прынесці карысць свайму народу людзей. Салідарнасць, паразуменне і патрыятызм заўсёды былі і застаюцца галоўнымі якасцямі беларусаў. Гэтыя каштоўнасці дапамагаюць захаваць самабытнасць, нацыянальны гонар, любоў да Айчыны і да сваёй малой радзімы. У Год міру і стваральнай працы Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Патрыёты Беларусі» праводзіць асаблівую акцыю, у выніку якой у Беларусі з'явіцца алея сцягоў. Чакаецца, што на ёй размесціцца больш за 150 сцягоў.



«Мы вырашылі не аб'язджаць 118 раённых цэнтраў, як раней, а сустрэцца ў адным горадзе кожнага рэгіёна, які і стане цэнтрам адзінства, — расказаў журналістам **старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Патрыёты Беларусі» Мікалай ЗАРУБІЦКІ**. — Сёння ў гэтым знакавым месцы — у самым высокім геаграфічным пункце краіны, на вышыні 345 метраў над узроўнем мора, адбылося адкрыццё Рэспубліканскай акцыі «Сімвал Адзінства — 2023». Галоўная мэта — кансалідацыя грамадства. Адбудуцца дыялогавыя пляцоўкі, перадача сцягоў, канцэртныя праграмы... Мы хочам, каб мерапрыемствы праходзілі ў розных фарматах. Мы рады таму, што да нас далучаюцца людзі, мы вельмі адкрытыя. Чым больш нас будзе, тым лепш».

Кіраўнік грамадскага аб'яднання нагадаў, што летась удзельнікі падобнай акцыі праехалі ўсе 118 раённых цэнтраў пад дэвізам «Мы ўсе адзіны механізм».

«У гэтым годзе вырашылі сэнс паглыбіць, — працягнуў Мікалай Зарубіцкі, — вырашылі стварыць у Мінску алею сцягоў рэгіёнаў нашай краіны. На ёй будуць прадстаўлены ўсе сцягі гарадоў і раённых цэнтраў Беларусі. Пад кожным сцягам — QR-код, праз які можна даведацца пра славутасці і гісторыю раёна. Мы ўсе, прымаючы ўдзел у дадзеным мерапрыемстве, робім гісторыю. Нас аб'ядноўваюць сімвалы нашай краіны, родная зямля».

Падчас урачыстай цырымоніі таленавітыя і заслужаныя прадстаўнікі рэгіёнаў — настаўнікі, пісьменнікі, работнікі сельскай гаспадаркі, дарожнай службы, лекары — перадалі сцягі раёнаў і гарадоў Мінскай вобласці выхаванцам ваенна-патрыятычнага клуба «Граніт». Апошнія перадалі палотны старшыні Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Патрыёты Беларусі» Мікалаю Зарубіцкаму. Урачыстая перадача сцягоў адбылася каля архітэктурнай кампазіцыі «Сцяг Радзімы», што ўсталявана на найвышэйшым пункце нашай краіны.

Сёння ўдзельнікі акцыі наведаюць Магілёў, 9 верасня — Гродна, 11 верасня — Віцебск, 12 верасня — аграгарадок Ленін у Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці, 15 верасня — Баранавічы ў Брэсцкай вобласці. Завяршыцца акцыя ў Мінску.

Падчас цырымоніі перадачы сцягоў на гары Дзяржынскай было адзначана, што ўсе мы — частка адной краіны. Кожны чалавек, кожны населены пункт важны. І толькі разам мы зможам зрабіць нашу краіну яшчэ мацнейшай.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.**
*Дзяржынскі раён.*

# МІНСК — ГОРАД УСМЕШАК

## РАЗАМ З РАСІЙСКІМІ РЭГІЁНАМІ

Адказваючы на пытанне аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі, старшыня Мінгарвыканкама адзначыў, што адміністрацыі раёнаў Мінска замацаваны за суб'ектамі Расійскай Федэрацыі.

— Гэта наш партнёр, з якім сёлета было дасягнута шмат чаго па розных напрамках дзейнасці, — падкрэсліў мэр горада. — Напрыклад, у сферы прамысловасці ўпор быў зроблены на адкрыццё сумесныай вытворчасці. Гэта дало магчымасць пашырыць кааперацыю і вырашаць самыя розныя пытанні ў кантэксце развіцця.

Ён нагадаў, што ў Расіі цяпер працуе вялікая колькасць самай разнастайнай тэхнікі, выраблена у Мінску. Яна задзейнічана і ў камунальнай сферы, і ў сельскай гаспадарцы, і ў перавозках пасажыраў. А адкрыццё сэрвісных цэнтраў у Расіі дазволіць яшчэ больш нарасціць пастаўкі тэхнікі ў яе рэгіёны.

Ён таксама расказаў аб перспектывах супрацоўніцтва з рэгіёнамі ўсходняй суседкі ў пытаннях адукацыі і аховы здароўя. У прыватнасці, ёсць патэнцыял для сумеснай вытворчасці медыцынскіх прэпаратаў, абсталявання, а таксама ўкаранення новых тэхналогій.

## З ПАДЗЕМНЫХ КРЫНІЦ

Па словах Уладзіміра Кухарава, штосутачнае спажыванне вады ў сталіцы дасягае адзнакі ў 450—470 тысяч кубаметраў. Каб яе пастаўляць у горад цалкам з падземных крыніц, не хапае каля 120—130 тысяч кубаметраў. Але ў крокавай даступнасці ад Мінска водазабораў, якія змаглі б даць такі аб'ём вады, няма. Таму быў распрацаваны маштабны для горада праект па задзейнічанні водазабораў, якія знаходзяцца на адлегласці 30 з лішнім кіламетраў ад горада. Гэта Феліцыянава, Віцкаўшчына і Вострава.

Каб атрымаць адтуль артэзіянскую ваду, неабходна зрабіць каля 90 свідравін. Але ваду мала атрымаць — яе яшчэ трэба даставіць. Для гэтага неабходна дадаткова пракласці каля ста кіламетраў трубаправодаў буйнога дыяметра — да 1 метра 20 сантыметраў.

— Каля 40 % патрабаванай даўжыні труб ужо выкладзена. У прыватнасці, гэтыя работы ўздоўж МКАД планує завяршыць да канца года, — адзначыў Уладзімір Кухараў. — Акрамя таго, у раёне вуліцы Курчатава будуецца станцыя другога ўздыму. У цэлым будаўнічыя работы плануецца завяршыць да ліпеня 2024 года. Потым пачнецца працэс наладкі. Плануем, што сістэма падачы вады на захад горада з артэзіянскіх крыніц будзе наладжана да канца наступнага года.

## НА АПЯРЭДЖАННЕ

— Большасць зваротаў грамадзян тычацца дзейнасці жыллёва-камунальных арганізацый сталіцы, — паведаміў старшыня гарвыканкама. — Мы імкнёмся прагназаваць сітуацыю, а таму вялікую ўвагу ўдзяляем аналізу, які забяспечвае служба «115». Стараемся працаваць на апярэджанне. Адсочваем сітуацыю літаральна па кожным жылым доме, і, калі дзесьці азначыліся якія-небудзь праблемы, напрыклад, у плане электразабеспячэння, ацяплення і г. д., імкнёмся аператыўна вырашаць.

Напрыклад, мы ўважліва вывучылі звароты па рабоце сістэм ацяплення ў папярэднім годзе, каб устараніць парушэнні да пачатку новага ацяпляльнага сезона. Падобныя меры дазваляюць знізіць колькасць зваротаў, забяспечыць стабільную работу арганізацый ЖКГ і сэканоміць пэўныя сродкі.

Ёсць, зразумела, звароты па рабоце ўстаноў аховы здароўя, адукацыі, органаў сацыяльнай абароны, будаўнічай галіны. Усе яны грунтоўна разбіраюцца. Наша мэта — максімальнае зніжэнне зваротаў грамадзян і мінімізацыя наступстваў узніклых праблем.

## НА ТРЭЦЯЙ ЛІНІІ

Па словах мэра, работы па пракладцы тунэляў трэцяй чаргі Зеленалужскай лініі метро будуць весціся ад плошчы Бангалор у напрамку вуліцы Мельнікайтэ. Цяпер у раёне плошчы Бангалор перакладаюць сеткі і рыхтуюць тэрыторыю для таго, каб у катлаван можна было апусціць тунэлепраходчы комплекс, які будзе рухацца да станцыі метро «Юбілейная плошча».

Чакаецца, што неабходны пасажырапаток на новым участку падземкі з'явіцца адразу пасля яе запуску. Кварталы, якія размешчаны непасрэдна каля будучых станцый, густа населены, крыху далей растуць новабудоўлі. Непадалёк размешчаны і буйны жылы масіў у раёне вуліцы Гая. Акрамя таго, трэцяя лінія будзе арыентавана і на жыхароў новага мікрараёна «Паўночны Бераг».

Для падвозу жыхароў да метро будзе выкарыстоўвацца электратранспарт, у тым ліку з выкарыстаннем выдзеленых палос. Найбольш прыдатным відам транспарту тут выглядае электробус.

У той жа час старшыня нагадаў, што будаўніцтва другой чаргі трэцяй лініі метро плануецца завяршыць у канцы 2024 года. Яе складуць тры станцыі — «Аэрадромная», «Немаршанскі сад» і «Слуцкі гасцінец», а таксама электрадэпо.

## УСЁ ДЛЯ МОЛАДЗІ, УСЁ ДЛЯ СПОРТУ

Працягваецца ўзвядзенне Нацыянальнага футбольнага стадыёна і басейна міжнароднага стандарту. Па словах Уладзіміра Кухарава, будаўніцтва ідзе даволі інтэнсіўна. Практычна ўсе работы па ўстаноўцы металічных канструкцый завершаны. Цяпер стаіць задача да зімовага перыяду закрыць контур, каб была магчымасць працаваць па аздабленні, камунікацыях і гэтак далей. Стадыён і басейн стануць значнымі для горада аб'ектамі міжнароднага ўзроўню, дзе можна будзе праводзіць любыя спаборніцтвы.

— У верасні пачнецца рэканструкцыя стадыёна «Трактар» — аднаго з найстарэйшых стадыёнаў у Мінску. Прынялі рашэнне зрабіць там яшчэ некалькі пляцовак, футбольных палёў для трэніровак моладзі, — адзначыў Уладзімір Кухараў.

Паводле яго слоў, аб'ект стане маладзёжнай будоўляй. У выніку гэта будзе месца прыцягнення не толькі ў плане заняткаў спортам, але і для правядзення розных творчых мерапрыемстваў. Акрамя таго завяршаецца рэканструкцыя гімнастычнага комплексу. Чакаецца, што ў кастрычніку яго ўвядуць у эксплуатацыю.

## ГОРАД УСМЕШЛІВЫХ ЛЮДЗЕЙ

— Да нас на Дзень горада традыцыйна прыязджае вялікая колькасць замежных дэлегацый. І мы хацелі б скарыстацца гэтай магчымасцю для развіцця эканамічнага супрацоўніцтва, — паведаміў Уладзімір Кухараў. — Наша задача — даць пляцоўкі для сустрэчы прадстаўнікоў бізнесу, каб яны маглі абмеркаваць перспектыўныя праекты і дамовіцца. Такое завязванне кантактаў у далейшым перарастае ў кантракты.

У суботу, 9 верасня, жыхароў і гасцей сталіцы чакаюць не толькі на агульнагарадскіх, але і на раённых пляцоўках, дзе запланавана вялікая колькасць самых розных мерапрыемстваў.

— Мінск сустракае свой чарговы дзень нараджэння прыгожым, чыстым і бяспечным горадам усмешлівых людзей, — падкрэсліў старшыня гарвыканкама ў завяршэнні размовы.

**Сяргей РУЧАНАЎ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Апазіцыйныя партыі Фінляндыі збіраюцца выказаць вотум недаверу ўраду



У Фінляндыі парламенцкія фракцыі Сацыял-дэмакратычнай партыі, «Зялёных» і «Саюза левых сіл» маюць намер выказаць недавер кабміну ў сувязі з падрыхтаваным урадам дакладам аб мерах па барацьбе з расізмам і дыскрымінацыяй. Недавер апазіцыйныя партыі маюць намер выказаць таксама міністрам ад нацыянал-радыкальнай партыі «Сапраўдныя фіны», якія допускалі расісцкую рыторыку. Як заявіў падчас абмеркавання ў парламенце палажэнняў даклада прэм'ер-міністр Петэры Орпа, «меры, выкладзеныя ў дакладзе, пасылаюць выразны сігнал аб прыхільнасці ўрада рабоце па барацьбе з расізмам». Аднак апазіцыя лічыць, што даклад вызначаецца адсутнасцю канкрэтыкі, не ўлічвае інтарэсы ўсіх пластоў грамадства, у тым ліку мігрантаў. Старшыня «Саюза левых сіл» Лі Андэрсан заклікала ўрад адмяніць некаторыя пункты сваёй праграмы.

### Tesla выпусціла двухмільённы электрамабіль на заводзе ў Шанхаі



Заснаваная ў студзені 2019-га гігафабрыка стала першым падобным прадпрыемствам Tesla за межамі ЗША, вытворчасць тут пачалася ў снежні таго ж года. Першы мільён аўтамабіляў быў выраблены больш чым за 30 месяцаў, а другі мільён — менш чым за 13 месяцаў. «Павелічэнне хуткасці вытворчасці аўтамабіляў неаддзельнае ад спрыяльнага бізнес-асяроддзя ў Шанхаі, асабліва ў новым раёне Ліньган шанхайскай пілотнай зоны свабоднага гандлю», — сказаў дырэктар па вытворчасці і эксплуатацыі завода Tesla Шанхаі Сун Ган, словы якога цытуе агенцтва «Сіньхуа». Пастаўкі з шанхайскага прадпрыемства ў студзені — жніўні перавысілі 600 тысяч электрамабіляў. Гэта больш за паказчык за ўвесь 2021 год. Выпушчаныя тут машыны прадаюцца ў Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне, а таксама ў краінах Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

### Японія запусціла ракету з месяцавым пасадачным модулем



Японскае аэракасмічнае агенцтва JAXA заявіла, што першы японскі месяцавы модуль SLIM (Smart Lander for Investigating Moon), які быў запушчаны на ракеце-носьбіце H2A з касмадрома Танэгасіма, паспяхова выйшаў на зададзеную арбіту, паведаміла PIA «Навіны». Аддзяленне месяцавага модуля адбылося праз 47 хвілін пасля запуску. Японскі месяцавы пасадачны модуль SLIM павінен будзе адпрацаваць тэхналогію высокадакладнай пасадкі апаратаў у межах ста метраў (а не кіламетраў, як звычайна) ад запланаванага пункта на паверхні натуральнага спадарожніка Зямлі. Падчас спуску ён будзе вывучаць кратары і рэльеф Месяца. Згодна з разлікамі японскіх экспертаў, модуль выйдзе на месяцавую арбіту праз 3-4 месяцы, пасадка на Месяц будзе праведзена прыкладна праз 4-6 месяцаў. Асноўная задача месяцавага модуля — вывучэнне і фіксаванне паверхні з дапамогай спецыяльнай камеры, якая вымярае ўтрыманне жалеза і іншых элементаў на паверхні.

## Надвор'е

## СОНЕЧНА І СУХА, А Ў ДРУГОЙ ДЭКАДЗЕ ВЕРАСНЯ — ДА 30 ЦЯПЛА

**Гэты тыдзень у нашай краіне быў пад знакам зоны павышанага атмасфернага ціску. Нягледзячы на тое што ночы ўжо па-асенняму халодныя, днём ва ўмовах малавоблачнага надвор'я вераснёўскае сонца выграе паветра да 19—25 градусаў, а па паўднёвым захадзе краіны яшчэ на пару градусаў цяплей. А ў гэтыя выхадныя антыцыклон «Патрысія» працягне ўтрымліваць у Беларусі цёплае і без ападкаў надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя.**



У пятніцу раніцай у асобных раёнах згусціцца слабы туман. Днём паветра прагрэецца да 19—25 градусаў, па захадзе — да 27 цяпла. У першы дзень выхадных чакаецца камфортнае надвор'е. У гэты дзень ночшу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад 2 да 9 цяпла, а па заходняй частцы месцамі — да 12 градусаў. Удзень чакаецца 19—25 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах — да 27 цяпла.

Ноччу і раніцай у нядзелю ў асобных раёнах магчымы слабы туман. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад 3 да 10 градусаў, а па заходняй частцы месцамі — ад 11 да 13 цяпла. Днём слупок тэрмометра паднімецца да 20—26 градусаў, а па паўднёвым захадзе стане нават горача, калі ў разгар дня чакаецца да 28 градусаў.

Згодна з папярэднім прагнозам айчынных сіноптыкаў, наступны тыдзень таксама пачнецца пад знакам антыцыклону, а гэта значыць, што дажджы асабліва разлічваць не варта. Пры гэтым у начныя гадзіны тэмпература будзе вагацца ад 7 да 16 градусаў. У ноч на панядзелак месцамі паветра будзе халодным, калі тэмпература апусціцца да 4—6 градусаў. У сярэдзіне дня слупкі тэрмометраў па краіне пакажуць 20—29 градусаў. Ападкаў не чакаецца. Ноччу і раніцай у асобных раёнах згусціцца слабы туман.

У аўторак і сераду прагназуецца пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Начная тэмпература будзе ад 7 да 14 градусаў, а па захадзе — да 16 градусаў. Днём паветра прагрэецца да 22—29 градусаў. Лета працягваецца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Сваё кіно

# ГЕРОІ ЦІ АНТЫГЕРОІ

**У эфіры тэлеканала «НТБ-Беларусь» у суботу, 9 верасня, пакажуць крымінальную драму «Мяне завуць Арлекіна», якая з'явілася на кінастудыі «Беларусьфільм» у 1988 годзе.**



Рэжысёр Валерый Рыбараў зняў фільм па матывах аповесці Юрыя Шчэкачыхіна «Пастка 46, рост другі». Кінагісторыя супрацьстаяння дзвюх розных кампаній маладых людзей, дзе ў кожнага сваё бачанне жыцця і жаданне існаваць па сваіх правілах. Хлопец па мянушцы Арлекіна і яго сябры жывуць на паўстанку, але часта наведваюцца ў горад, каб нагадаць пра сябе яго жыхарам. Усе пытанні, як правіла, вырашаюцца з пазіцыі, што мае рацыю толькі мацнейшы. А ўскладняецца супрацьстаянне тады, калі дзяўчына Арлекіна сыходзіць ад яго да аднаго з «дзелавых», Інтэра, хлопца, які мае і машыну, і грошы, і сувязі... Гераяў гэтага трохвугольніка сыгралі Алег Фамін (Арлекіна), Святлана Капылова (Лена) і Ігар Кечаеў (Інтэр). А вось чым скончылася ўся тая гісторыя, ці перамагло дабро, а таксама ці моцна адрозніваецца сучасная моладзь ад маладых людзей таго часу, даведацца дапаможа кінасеанс. Дарэчы, гэты фільм лічыцца самым касавым беларускім кіно: за 15 месяцаў дэманстрацыі кінастужкі ў кінатэатрах СССР яго паглядзелі 41,9 млн чалавек.

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 180

Задача нашага чытача Чэслава Якубоўскага (Мінск) атрымала пахвальны водгук у конкурсе выдання MiniStar *(гл. дыяграму)*.



**Белыя:** Крс2, Фе2, Сс4, Cd4, Kf6, nf3 (6).

**Чорныя:** Крb4 (1).

Мат за два хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Наступная задача таго ж аўтара адзначана ганаровым водгукам у міжнародным конкурсе памяці вядомага расійскага шахматнага кампазітара Юрыя Сушкова.

**Белыя:** Крg4, Лd1, Лh3, Cd2, Kb6, Kd5, пп. c5, f5, g5 (9).

**Чорныя:** Крe5, Ch8, Kg6, пп. b5, d4, e4 (6).

Мат за два хады.

1...d3 2. Cc3x, 1...K~ 2. Cf4x Падманныя сляды: 1. Ce3? ~ 2. C:d4x, 1...de 2. Kd7x, але 1... d3!; 1. Ke3? ~ 2. Kd7x, 1...de 2. Cc3x, але 1...Kf8! (перакрыта лінія d2-f4, няма 2. Cf4?); 1. Kc3? ~ 2. Kd7x, 1...dc 2. C:c3x, 1...Kf8 2. Cf4x, але 1...d3! (заблакіравана поле c3, няма 2.C:c3?). Рашае 1. Cc3! ~ 2. C:d4x, 1...dc 2. Kd7x, 1...e3 2. Л:e3x

* * *

У Брэсце прайшлі першынствы Беларусі па рапідзе і бліцы сярод юнакоў і дзяўчат да 12, 14 і 16 гадоў. У бліцы прызёрамі сталі:

юнакі да 12 гадоў — 1) Радзівон Сідарэня (Баранавічы); 2) Мацвей Савельеў (Мінск); 3) Міхаіл Прылуцкі (Брэст);

юнакі да 14 гадоў — 1) Аляксандр Гвоздзь (Мінск); 2) Аляксандр Дзяркач (Гомель); 3) Арцём Шыдлоўскі (Мінск);

юнакі да 16 гадоў — 1) Міхей Навуменка (Орша); 2) Дамір Булгак (Мінск); 3) Арцём Бяляўскі (Мінск);

дзяўчаты да 12 гадоў — 1) Ніка Венская; 2) Аляксандра Каспяровіч; 3) Анастасія Севасцянчук (усе — Мінск);

дзяўчаты да 14 гадоў — 1) Вераніка Абрамкіна (Магілёў); 2) Карына Койшман (Мінск); 3) Маргарыта Бендзік (Магілёў);

дзяўчаты да 16 гадоў — 1) Вікторыя Дорашава (Гомель); 2) Лізавета Андруховіч (Светлагорск); 3) Ксенія Норман (Гродна).

А вось прызавыя тройкі ў рапідзе:

юнакі да 12 гадоў — 1) Міхаіл Прылуцкі (Брэст); 2) Мацвей Савельеў (Мінск); 3) Антон Віцюк (Мінск);

